# Мая Радзіма - Беларусь

Бягун Паліна
Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 43 г. Мінска»,
6 “Б”клас

Ці завылі ваўкі, ці заенчыў віхор,
Ці запеў салавей, ці загагала гусь, -
Я тут бачу свой край, поле, рэчку і бор,
Сваю матку-зямлю - Беларусь.

Я. Купала

Б-Е-Л-А-Р-У-С-Ь. Што для мяне значыць гэтае слова? Што я чую ў яго гучанні? Што адчуваю, калі вымаўляю?

Заплюшчваю вочы і ўяўляю блакітнае неба з чыстымі белымі аблокамі; зялёнае поле, на якім, нібы сінія матылі, калышуцца на ветры васількі. І буслоў, што расправілі свае крылы і, здаецца, абдымаюць маю краіну, маю Беларусь. Адчуваю, як на твары з'яўляецца ўсмешка. Удыхаю на поўныя грудзі. Так спакойна і надзейна становіцца на душы. Нават паветра робіцца асаблівым: колкі пах калосся перамяшаўся з мядовым водарам кветак і травы.

Прыхінаюся да зямлі. Пачынаю адчуваць усю яе моц і боль адначасова. Моц і боль... Беларуская зямля прасякнута болем і слязамі нашых продкаў, ім прыйшлося перажыць многа нягод. Сярод іх – самая страшная вайна, якая забрала шмат жыццяў. Іх лёс - гэта лёс і маіх сваякоў.

Мой прадзед служыў у партызанскім атрадзе імя Варашылава. Быў узяты ў палон. Збег, ваяваў, але да канца вайны так і не дайшоў. Дзядзька майго прадзеда быў шаўцом. Ён забяспечваў абуткам салдат. Меў медаль за заслугі перад Айчынай. Бацька маёй бабулі адважна ваяваў у бітве пад Курскай дугой.

У кожнага з нас свая гісторыя. Я нарадзілася і жыву ў сталіцы, у горадзе-героі Мінску. Я люблю свой горад, люблю гуляць па яго вуліцах. Асабліва захапляе мяне Верхні горад. Вузкія вулачкі пятляюць, падымаючыся то ўверх, то ўніз, запрашаючы ў займальнае падарожжа па старым Мінску. Ідзеш па іх - і быццам уяўляеш тыя падзеі, якія адбываліся тут у розныя часы. Так і бачыш, як па гэтай брусчатцы прагульваліся прыгожыя паненкі з markмознакаляровымі парасончыкамі, цвёрда хадзілі мужныя кавалеры, змагаліся за сваю даму. Бачылі гэтыя вулачкі і грозных захопнікаў, якія прыходзілі ў нашу краіну. Многа часу прайшло, але дух старога горада тут можна адчуць і сёння.

Але найбольш адчуваецца дух Беларусі па-за межамі нашай сталіцы. Самае ўтульнае месца для мяне – Вязынка. Гэта месца нараджэння майго любімага Песняра, народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Тут ён у 1882 г. пабачыў свет, тут захаваўся дом сям'і Луцэвічаў. Заходжу унутар. Чамусьці здаецца, што я ў гасцях у бабулі. Чую трэск у печы. Вось-вось бабуля дастане аладкі і прынясе духмянага мёду. Усё такое роднае і блізкае сэрцу. Душу

кранае навакольная прырода. Старыя дрэвы, раскінутыя над ракой, валуны, ліпавая алея, сад. Залажу на клён, што ляжыць на беразе рачулкі. Думкі адразу пачынаюць раіцца ў галаве. Сонечныя праменьчыкі казычуць шчокі. І на сэрцы адразу становіцца так лёгка і хораша.

Я яшчэ маленькая, але шчаслівая дзяўчынка. У мяне ёсць бацькі, якія заўсёды побач. І ёсць мая Беларусь. Якая яна для мяне? Светлая і чыстая, незалежная і прасторная, васільковая і шчырая, а самае галоўнае - родная. Мая «зямля пад белымі крыламі».